# Покліч Волі

**ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, № 11(49)**
**СНЕЖАНЬ 2008 ГОДА**





## З Новым годам!

*Сардэчна віншуем Вас з Новым годам і Калядамі! Няхай Новы год прынясе ў вашы дамы шмат новага, добрага, прыемнага. Моцнага вам і вашым сем'ям здароўя, цяпла блізкіх, кахання і ўзаемаразумення. Новых здзяйсненняў і здабыткаў. Са святам!*

## УЧАСТАК ДАРОГІ АДКРЫТЫ

**Дарожныя службы Беларусі адкрылі рух па новым участку дарогі з мастом праз Заходнюю Дзвіну на паўднёва-заходнім абыходзе Віцебска. Участак Дымаўшчына – Ноўка агульнай працягласцю 12 кіламетраў злучыў рэспубліканскія дарогі Р-20 Віцебск – Полацк – мяжа Латвіі і Р-25 Віцебск – Сянно – Талачын.**

У выніку частка транзітных патокаў, галоўным чынам грузавых, будзе абыходзіць Віцебск бокам, што паспрые экалагічнай сітуацыі ў горадзе. Заказчыкам будаўніцтва паўднёва-заходняга абыходу Віцебска з'яўляецца РУП "Віцебскаўтадор", паведамляе БелТа.

## ВЫ ВЕРЫЦЕ Ў ШЧЫРАСЬЦЬ УЛАДЫ?

**Барацьба ўлады за лёсы дзяцей з сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане, набывае усё большыя абароты. Здаецца, што гэтая праблема з'яўляеецца найбольш вострай з усіх існуючых. Чынавенства ўсіх рангаў, настаўнікі, журналісты, міліцыя, грамадскасць змагаюцца за дзіцячыя правы і ў дзень і ў начы.**

Але колькасць падобных сем'яў, здаецца, павялічваецца з кожным днём. Ёсць падобныя сем'і і ў Задубровенскім с/с. Адна атабарылася ў Слабадзе, тры—у Задуброўі. На чатыры сям'і—15 дзяцей, якія з-за бацькоўскай нядбайнасці пазбаўлены элементарных бытавых зручнасцяў, а часам папросту недаядаюць.

Ёсць у сельсавеце і 7 бацькоў, якія мусяць кампенсаваць затраты на ўтрыманне дзяцей у дзяржустановах. Шасцёра з іх уладкаваныя на працу, а яшчэ адна маці знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку і мае вялікую запазычанасць перад дзяржавай.

У гэтым супрацьстаянні дзяржавы і нядбайных бацькоў крайнімі заўжды будуць бацькі. У чынавенства падобныя сем'і акрамя галаўнога болю нічога не выклікаюць. Пачуцця віны за існуючую сітуацыю з боку ўлады вы не адшукаеце. Няма яе і ў бацькоў. Пакутуюць дзеці.

Але калі падысьці да гэтай праблемы неперадузята, то віна ўлады тут можа не меншая чымся бацькоўская. Колькасць сацыяльна інфантыльных маладзёнаў, пазбаўленых усялякага пачуцця адказнасці павялічваецца з кожным годам. Школа як дзяржаўная ўстанова не выконвае сваіх абавязкаў па падрыхтоўцы навучэнцаў да выканання сваіх сацыяльных функцый у сферы сям'і, соцыюму міжасабовых зносін... Сям'я ж і наогул даўно ўжо ўхілілася ад выканання сваіх абавязкаў, бо з часоў набыцця незалежнасці Беларуссю была дэзарыентавана паводзінамі ўлады ў дачыненні да сваіх абавязкаў. А каб не памыліцца, цалкам усклала гэтую функцыю на школу, якая ў сваю чаргу жыве састарэлымі ўяўленнямі савецкіх часоў. І таму ніякіх станоўчых вынікаў дасягнуць не ў стане.

Татальная алкагалізацыя насельніцтва ідзе з двух бакоў. З аднаго боку ўлада сама спойвае людзей, а затым змагаецца з наступствамі сваёй дзейнасці. З другога ж боку—гэта рэакцыя соцыюму на неэфектыўную сацыяльна-эканамічную палітыку ўлады. Як добры антыдэпрысант, алкаголь ратуе ад дурнотаў нашага жыцця. Праўда яшчэ і ў тым, што ўлада п'е ніколькі не менш, чым тыя самыя нядбайныя бацькі, толькі ступень featured рознага роду абароненасьці і рознага роду імунітэтаў ў яе большая. І п'е яна не " максімку", а больш якаснае пойла.

Не ведаю як вы, а я ў шчырыя захады ўлады ў гэтай сферы не веру.

**Янка Здольнік.**

## СВЯТА КРОЧЫЦЬ

Напярэдадні свята Божага Нараджэння па традыцыі запалілі агні на галоўнай гарадской яліне. А вось парад Дзядоў Марозаў і Снягурак адбыўся ўпершыню. Цырымонія запальвання агнёў выклікала вялікую зацікаўленасць у гараджан. На плошчу Свабоды прыйшло столькі ж людзей, як і пад час "Славянскага базара". Каля лясной прыгажуні міліцыя нават усталявала кантрольна-прапускныя пункты з металадэтэктарамі.

Парад персанажаў навагодняга свята рухаўся ў суправаджэнні духавога аркестра ад вуліцы Савецкай па вуліцы Леніна да плошчы Свабоды. Галоўны Дзед Мароз Віцебска са сваёй унучкай і світай ехаў ва ўпрыгожанай ілюмінацыяй коннай брычцы. А натоўп Дзядоў больш нізкага рангу рухаўся ўслед за ім пехатой. За казачнымі героямі ішла сотня лепшых спартоўцаў горада. Апошняй рухалася калона з машын МНС, міліцыі, аблпошты, хуткай дапамогі, таксі. Кіроўцамі ў іх таксама былі Дзяды Марозы.

У той самы момант, калі елка па загаду галоўнага Дзеда Мароза заззяла чароўнымі агнямі, неба над Віцебскам расквеціў салют у гонар 2009 года. Крыху пазней адбылося вогненнае шоу, так што на недахоп уражанняў у гэты вечар ніхто не мог паскардзіцца.

Адзіным сумным момантам былі, як заўжды, прамовы. Елка сёлета атрымалася цалкам еўрапейскай, а вось нашыя чыноўнікі, напэўна, ніколі не навучацца прамаўляць сцісла і па тэме. Выступаючы перад прысутнымі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, былы старшыня Віцебскага гарсавета дэпутатаў Генадзь Грыцкевіч адзначыў, што галоўнай падзеяй адыходзячага года былі выбары ў парламент. Вельмі спрэчнае сцверджанне: для кагосьці галоўнай падзеяй года стала нараджэнне дзіцяці, для іншага – наваселле, а для кагосьці – цікавая вандроўка. А хтосьці, можа, у Год здароўя, нарэшце, кінуў паліць… Што простым людзям тыя выбары?

**Дзед Мароз.**

## АБ'ЯВА

***Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Покліч волі" паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.***

***Рэдакцыя абвяшчае конкурс чытачоў "І такое бывае!". Удзельнікаў конкурсу чакаюць прызы, а пераможцу -- сюрпрыз! Матэрыялы дасылайце на адрас рэдакцыі. Апошні тэрмін – 31 снежня. Вынікі конкурсу будуць падведзены у першым навагоднім нумары.***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Покліч волі".***

## Цэментны Сувораў знік

Помнік расейскаму фельдмаршалу Сувораву, кату беларускага народа, усталяваны перад домам №28, па вуліцы імя Суворава, дзе раней размяшчаўся гарадскі ваенкамат, больш не існуе.

Бюст Суворава быў усталяваны ў 1952 г. Восенню 1998 г. ён нечакана знік са свайго пастамента, а праз нейкі час знайшоўся ў адным з суседніх двароў. У яго скраданні абвінавачвалі вядомага віцебскі апазіцыянера Уладзімера Плешчанку. На 6 месяцаў ён быў зняволены ў следчым ізалятары, але суд не змог даказаць яго віны. Мастацказнаўчая камісія прызнала бюст Аляксандра Суворава, выкананы з цэменту, не маючым мастацкай і гістарычнай каштоўнасці.

## Што год наступны нам рыхтуе?

Апошнія выступы і сустрэчы Лукашэнкі патанулі ў атмасферы перадднавагодняй эйфарыі. Стомленае насельніцтва, заплюшчыўшы вочы, кінулася ў вір святочнай мітусні. Прывід фінансавай крызы мала каго хвалюе. Ніякай цвярозай ацэнкі сітуацыі пакуль не чуваць. Контркрызавых захадаў ніхто не робіць. Улада і бізнес цягнуцца ў хвасце падзей, спадзяючыся на Захад, не расейскія крэдыты, на нейкае дзіва, якое мусіць не толькі ўратаваць, але і ўзняць на нейкі недасяжны ўзровень.

Па-савецку аптымістычна гучыць назва інтэрв'ю ("Галоўнае - эканоміка і стабільнасць") з намеснікам старшыні гарвыканкаму В. Дарожкіным, апублікаванае ў раённай газеце " Жыццё Прыдзвіння" за 24 снежня.

Сыходзічы з падзагалоўка ("...у сувязі з вядомымі крызіснымі з'явамі сытуацыя... патрабуе прыняцця эфектыўных мер па іх мінімізацыі") заступнік старшыні разумее ўсю складанасць сытуацыі, якая склалася ў раёне і мусіць ведаць шляхі яе пераадолення. Абвастрылася праблема рэалізацыі прадукцыі, але кіраўніцтва прадпрыемстваў ведае, што трэба зніжаць запасы на складах і змагацца з дэбітарскай запазычанасцю.

У раёне ідзе карэнная рэканструкцыя вытворчасці, узнаўленне актыўнай часткі асноўных фондаў і ўкараненне сучасных тэхналогій. Вытворчасць прамысловай прадукцыі ў наступным годзе павялічыцца ў параўнанні з ўзроўнем 2008 года на 116%, а спажывецкіх тавараў на 114%.

Знешнеэканамічная дзейнасць асвятляецца досыць цьмяна. Экспарт прадукцыі склаў 170,1%, імпарт - 159,1%. Асабліва неспрыяльныя справы ў ААА " Віцебская бройлерная птушкафабрыка". Адмоўная сальда складае тут 13015,7 тыс. даляраў.

У сферы інвестыцый справы, здаецца, неблагія. У 2008 годзе ў развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы ўбухалі немалыя сродкі. ААА " Віцебская бройлерная птушкафабрыка" распрацавала бізнес-план на набыццё абсталявання на 8, 4 млн. даляраў ЗША. У 2009 г. плануецца прырост інвестыцый на 25% да ўзроўня 2008г. Які эканамічны эфект будзе ад усіх гэтых пераўзбраенняў і мадэрнізацый і ці будзе ён наогул не паведамляецца.

Самы цікавы, але адначасна і самы кароткі, момант інтэрв'ю—гэта эканамічны стан суб'ектаў гаспадарання. Узровень рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі, работ і паслугаў прадпрыемстваў і арганізацый паменшыўся на 2,1 адсоткавых пункты і склаў 11,5%. У сельскай гаспадарцы - на 1,5% і 13,6%, у прамысловасці—на 6,6% і 1,2%. Колькасць нерэнтабельных прадпрыемстваў скарацілася на 50 %, пры плане на год 70 %.

Галоўная выснова інтэрв'ю: не працуйце "на склад", бо так сказаў Лукашэнка, а знаходзьце шляхі рэалізацыі гатовай прадукцыі. Гэта нават не ісціна, а хутчэй банальнасць, зразумелая дзіцяці.

Па сутнасці гэтае інтэрв'ю—звычайная статыстычная справаздача. Толькі падаецца яна праз больш дэмакратычны публіцыстычны жанр. Улада паспрабавала зрабіць крок на сустрэчу грамадскасці, але грамадскасць у бальшыні сваёй гэтага і не заўважала. Дый спроба паказной лібералізацыі , калі яна там наогул і была, па сутнасці атрымалася няўклюдная.

З інтэрв'ю складаецца ўражанне поўнай несамастойнасці мясцовай выканаўчай улады. З-за адсутнасці ліберальнага досведу яна нявольная ў сваіх дзеяннях, а ўсяго толькі рэагуе на загады, якія ідуць зверху, бо адказвае перад ёю, а не перад народам. Далі грошы на рэалізацыю "Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця малых гарадскіх паселішч"—узялі і закапалі ў зямлю, бо тэрміны рэалізацыі змушаюць варушыцца, а не думаць. Прыйшлі інвестыцыі пад іншыя патрэбы—скарысталіся і забылі, бо зашмат узяла на сябе ўлада, што не ў стане ўжо кантраляваць і сачыць за якасцю.

Хацелася б таксама даведацца з гэтага інтэрв'ю пра мяркуемыя экспертныя эканамічныя прагнозы на наступны год. Хацелася б таксама ведаць і імя эканамічнага эксперта, да паслугаў якога звяртаецца мясцовая ўлада. Толькі баюся, што эксперта, які быў бы здольным даць нейкі цвярозы прагноз наперад, не існуе ў Віцебску ў прыродзе. Дзякуючы намаганням існае ўлады, сучасныя навукоўчы здольныя толькі абслугоўваць чынавенскія запатрабавнні, а не папярэджваць грамадства пра магчымыя пагрозы, з якімі яно можа сутыкнуцца.

**Рэдактар.**

# ПРОДАННАЯ ПАМЯТЬ

Когда в Таллине переносили памятник воину-освободителю, они принимали гневные резолюции, писали обличительные письма и вообще орали дурным голосом, а когда в Минске сносят Музей Великой Отечественной войны, выбрасывают музей просто в никуда, они вдруг испугались и сидят тихонько-тихонько, не проронив ни слова. Даже удивительно, как разом исчез боевой дух, патриотизм, гнев на тех, кто «оскорбляет память», какими они стали понимающими, послушными и безголосыми.

Вместо Музея Великой Отечественной войны в центре Минска будет 35-этажный отель «Кемпински», и площадка под строительство нужна срочно, потому что какой-то высокопоставленный балбес уже дал гарантии иностранным инвесторам. Он не озаботился, куда будет выселен музей, куда будут перевезены 150 тысяч экспонатов, его не интересовало, как к этому отнесутся седовласые орденоносцы и их, гордые славой дедов и отцов, потомки. Он увидел призрак многих нулей на зеленоватых купюрах с портретами американских президентов и напрочь позабыл, что выселять музей на улицу придется в год 65-летия освобождения Беларуси. Конечно, это не оскорбление памяти, безусловно, это не означает, что в Беларуси продается все, даже святое, и почти наверняка – это уважительное отношение к тем немногим живым, кто время от времени проходит по тихим залам музея, чтобы посмотреть на молодые лица своих однополчан.

Помните, как из-за таллинского памятника захлебывались в гневе государственные белорусские СМИ? Хотя в Таллине было понятно, куда переносят воина-освободителя, и где он появится через несколько недель.

Где и когда будет восстановлен минский музей, уникальный сбор экспонатов о той великой борьбе и той великой победе, совершенно непонятно: будущее здание для него еще даже не в проекте, а только «в концепции». Но СМИ не возмущаются, надо – будут аплодировать, если очень надо – найдут ветеранов, которые «поддержат и одобрят». Хотя всем понятно, что

**Вместо Музея Великой Отечественной войны в центре Минска будет 35-этажный отель «Кемпински»**

коль уж очень понадобилось освободить Октябрьскую площадь для иностранных денег, то сначала надо было построить новое здание для музея, спокойно перевезти экспонаты, а потом уже устраивать на его месте стройплощадку. Потому что даже для обычной семьи переезд – это бедствие, а для любого музея – настоящая катастрофа.

Надо быть слишком высоко поставленным, чтобы не понимать простую земную вещь: музейные экспонаты нельзя складировать, им требуется особый режим хранения, их нельзя временно разместить по подвалам и ангарам, а потом через пару лет вынуть в целости и сохранности. То, что чудом сохранилось в лихолетье войны, просто не выживет после такого эксперимента «благодарных потомков».

Власти обещают, что через два года в районе стелы «Минск – город-герой» появится новый музей истории Великой Отечественной войны, какого, как вы понимаете, «нет нигде в бывшем Советском Союзе». Проектом занимается чрезвычайно популярный архитектор Виктор Крамаренко (автор Национальной библиотеки и минского железнодорожного вокзала, известных не только тем, что на их строительстве наворовались все, кто хотел, но и несколькими десятилетиями, которые проходили от подготовки проекта до его воплощения) и главный архитектор Минска Виктор Никитин. И они, конечно, не дадут гарантию, что в условиях финансового кризиса новое здание музея Великой Отечественной войны появится уже к 65-летию Победы, то есть к маю 2010 года. Более того, никто не даст такой гарантии! Потому что в условиях дефицита денег и катастрофического роста долгов мы запланировали еще одну гигантскую стройку – атомной электростанции, и понимающие люди не скрывают, что она может стать для Беларуси тем, чем стала для Советского Союза гонка вооружений, оставившая славных советских тружеников без приличных штанов и даже без туалетной бумаги.

Когда начнется строительство АЭС, будет, конечно, не до музеев – в этом сомнений быть не должно. То есть очень вероятна перспектива, что в память о великой победе мы сохраним только потешную и никогда не существовавшую «Линию Сталина». Дорогие ветераны, аплодируйте!

**Светалана Калинкина.**

# МАСАВЫЯ СКАРАЧЭНЬНІ НА ЗАВОДЗЕ «ГАРЫЗОНТ

**300 супрацоўнікаў заводу «Гарызонт» атрымалі ад кіраўніцтва прадпрыемства паведамленьня пра тое, што зь імі ня будзе працягнуты контракт і яны не атрымаюць кампенсацыі.**

Аб гэтым паведамляюць слухачы «Радыё Свабода».

«Вось зараз Лукашэнка кажа пра дэнамінацыю цэн. Хто пацерпіць? Лукашэнка і яго ная эліта не пацерпіць. А народ пацерпіць. Людзі і так атрымліваюць мізэрныя заробкі і пэнсіі. Што гэта за кіраўнік? Што гэта за «бацька»?..» – кажа спадар А.

Слухачы радыё сьцьвярджаюць, што сапраўдная праблема Беларусі – гэта не сусьветны фінансавы крызіс, ажахлівы стан эканомікі краіны.

«Сусьветны эканамічны крызіс — гэта паўбяды. Сапраўдная бяда — мы самі. Як у любой таталітарнай сыстэме, у нас попыт на чыноўнікаў, якія ведаюць толькі два прынцыпы паводзінаў: «Хачу, каб месяц стаў сонцам» ці «Чаго жадаеце?» У адваротным выпадку яны б знайшлі ў сабе сілы ўцямна патлумачыць кіраўніку, што нас чакаюць цяжкасьці і ня трэба ўпэўніваць электарат, што мы пабудавалі нейкую супэрэканоміку, непадуладную стыхіям. А цяпер няхай міністры ўпрагаюцца ў эшалёны з складзкімі ліквідамі, езьдзяць па сьвеце і ўпрошваюць хоць каго-небудзь купіць беларускае, пажадана ўтрая даражэй», - заўважае спадар В.

«Нашы прамысловыя тавары, якія не знаходзяць попыту ў тых краінах, у якія яны звычайна накіроўваліся, зараз затаварылі склады нашых прадпрыемстваў. Дык можа, ужо пара разьлічыцца з пэнсіянэрамі гэтымі таварамі, як абяцаў некалі кіраўнік краіны? Бо мы чакаем ужо амаль 12 гадоў, некаторыя ўжо не дачакаліся,» – нагадвае Ларыса зь Менску.

Прадпрымальнікі Беларусі правялі ў Менску шэсьце і мітынг на знак пратэсту супраць зьмены ўмоваў працы ад 1 студзеня 2009 году. Дробныя бізнэсоўцы таксама рыхтуюцца да маршу пустых рондаляў.

«З аднаго боку, наш правадыр мэтанакіравана зьніштажаў і амаль ужо зьніштожыў усіх прадпрымальнікаў. Сваімі недарэчнымі ўказамі ён стварыў зусім непрымальныя ўмовы для далейшай працы. А зь іншага боку, гэты ж правадыр заявіў нядаўна пра лібэралізацыю ўсяго грамадзка-палітычнага і эканамічнага жыцьця ў краіне. Як гэта разумець? І як гэта суаднесьці? Так і хочацца сказаць — ня верце лукаваму: ён у чарговы раз усё адно падмане», - заявіў спадар С.

Слухачы «Радыё Свабода» незадаволеныя масавым звальненьнем працаўнікоў і скарачэньнем працоўнага тыдня на прадпрыемствах.

«Ужо два тыдні навагрдзкае прадпрыемства «Таварыства сьляпых» знаходзіцца на чатырохдзёнцы. Вялікія сьвяты Новы год і Божае Нараджэньне людзі будуць сустракаць вельмі сумна», - хвалюецца спадарыня Л.

«Каля трохсот супрацоўнікаў заводу «Гарызонт» атрымалі падарунак на Каляды ад кіраўніцтва заводу ў выглядзе паведамленьня пра тое, што зь імі ня будзе працягнуты контракт. Кіраўнік краіны кажа, што ніводзін чалавек не апынецца на вуліцы. А вось 300 супрацоўнікаў заводу «Гарызонт» проста выкінутыя напярэдадні Калядаў на вуліцу», - скардзіцца спадарыня Е.

«Ужо зусім хутка надыдзе той час, калі ў Лукашэнку паляцяць айчынныя галёшы», - упэўнены спадар М.

# УКАЗ № 703 СОДЕРЖИТ НЕПРИЯТНЫЕ СЮРПРИЗЫ

**Эксперты неоднозначно оценивают указ № 703, подписанный Александром Лукашенко.**

Указ продлил на неопределенный срок порядок уплаты фиксированного НДС при ввозе товаров из России и тем самым снял протестные настроения в предпринимательской среде, отметил в беседе с корреспондентом БелаПАН руководитель оргкомитета по созданию Ассоциации малого и среднего предпринимательства Сергей Балыкин. Кроме того, к достоинствам указа он отнес возможность осуществления некоторых видов экономической деятельности без регистрации в качестве ИП, просто заплатив единый налог.

В то же время, по словам эксперта, новый нормативный акт содержит несколько неприятных сюрпризов для предпринимателей. Например, повышены ставки единого налога. Больше всего, считает С.Балыкин, пострадают предприниматели из небольших населенных пунктов, ведь для них по некоторым видам деятельности максимальная ставка единого налога выросла более чем в два раза.

При этом эксперт отметил, что вообще-то принятие указа не означает автоматического повышения ставок единого налога. Он только дает такую возможность областным и Минскому городскому советам депутатов. «Будем надеяться, что местные органы власти не пойдут по пути увеличения налоговой нагрузки, но ничего гарантировать нельзя», — сказал эксперт.

По его словам, наиболее неприятным для ИП сюрпризом является фактическое ограничение их максимальной выручки. Указ устанавливает, что при превышении выручки ИП 20-кратного размера единого налога предприниматель должен доплачивать 10% от своей выручки. «Для многих ИП сумма выручки в 20 ставок единого налога очень невелика и не позволяет окупить даже арендную плату. Тем самым индивидуальных предпринимателей экономическими методами заставляют переходить на общую систему налогообложения. Причем без административных запретов и протестов», — констатировал С.Балыкин.

«Можно ожидать, что появление подобной нормы приведет к усилению контроля за выручкой ИП и их кассовой дисциплиной. Разумеется, недавно президент ввел шестимесячный мораторий на проверки, и в эти полгода предприниматели смогут «нагулять жирок», — полагает эксперт.

С.Балыкин также обратил внимание на то, что за нарушения порядка уплаты единого налога установлена беспрецедентно суровая санкция — аннулирование регистрации в качестве ИП без права новой регистрации в течение всей жизни. «Кстати, термин «аннулирование» вызывает ряд вопросов. Нигде в других нормативных актах он не встречается, поэтому совершенно непонятно его значение. Будет ли это прекращение предпринимательской деятельности либо что-то иное. Эта и другие неточности, содержащиеся в указе, заставляют предположить, что он был подготовлен в большой спешке, что президент до последнего момента не знал, какое решение принять», — считает эксперт.

«По сути повторился сценарий двухлетней давности, когда предпринимателям накануне нового года продлили режим ввоза товаров из России , но ввели множество ограничений, например запретили использовать наемный труд», — напомнил С.Балыкин. «Я сомневаюсь, что появление указа стало результатом предпринимательских протестов. Скорее всего, его пролоббировали владельцы рынков и выставок, которые утрачивали своих арендаторов».

РУХ ЗА СВАБОДУ

# Рух “За свабоду” зарэгістраваны

19/12/2008 18:47

Міністэрства юстыцыі Беларусі перадало афіцыйнае пасьведчаньне аб рэгістрацыі “Руху “За свабоду” яго заяўнікам.

Першы свой установчы сход рух правёў яшчэ ў траўні 2007 году. Апошняе, чацьвёртае па ліку, рашэньне аб стварэньні грамадзкай арганізацыі было прынятае 23 кастрычніка сёлета ў Магілёве на ўстаноўчай канфэрэнцыі пры ўдзеле больш як 70 чалавек з розных рэгіёнаў Беларусі. Канфэрэнцыя зацьвердзіла статут і сфармавала кіроўчыя органы аб’яднаньня. Старшынём абраны Аляксандар Мілінкевіч. Яго намесьнікамі сталі Віктар Карняенка і Юрась Губарэвіч.

У інтэрвію “Свабодзе” Юрась Губарэвіч адзначыў: “Атрымалася зарэгістравацца толькі з чацьвёртай спробы. Але, на маю думку, нічога дзіўнага ў самім факце рэгістрацыі няма. Таму што зь юрыдычнага пункту гледжаньня тыя дакумэнты, якія мы падалі на рэгістрацыю, былі бездакорныя.

На нашу думку, такая ж сытуацыя была і ў тры мінулыя разы. Але сёньняшняя рэгістрацыя сьведчыць пра пэўныя зьмены ў стаўленьні рэжыму да грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі.

Вельмі б хацелася, каб факт рэгістрацыі “Руху “За свабоду” ня стаў выключэньнем з агульных правілаў нерэгістрацыі. І каб рэгістрацыю атрымалі ў найбліжэйшы час незалежныя і дэмакратычныя арганізацыі, якія правялі свае ўстаноўчыя сходы і падалі адпаведныя дакумэнты ў Міністэрства юстыцыі».

**Заснавальнік і рэдактар:** Сяржук Салодкі

**Адрас рэдакцыі:** г.Віцебск, 3-я Мопраўская, д. 14, тэл. 26-42-02, маб. +375299410197

Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна.